Белорусский государственный университет
Центр проблем развития образования ГУУиНМР

# НАПРАВЛЕНИЯ И МЕХАНИЗМЫ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ ПРЕПОДАВАНИЯ В ВЫСШЕЙ ШКОЛЕ

Материалы
Международной научно-практической интернет-конференции,
Минск (2014 г.)

Минск 2014

УДК 378
ББК 74.58
У 90

Редакционная коллегия:
Е.Ф. Карпиевич (отв. ред.), В.В. Самохвал, А.А. Полонников
Д.И. Губаревич, И.Е. Осипчик

Рецензенты:
Доктор педагогических наук, профессор В.И. Казаренков,
Кандидат психологических наук, доцент Е.Л. Касьяник

У 90 Направления и механизмы совершенствования преподавания в высшей школе: материалы Международной науч.-практ. конф., Минск, 22-23 октября 2014 г. / Белорусский государственный ун-т. Центр проблем развития образования ГУУиНМР; под ред. Е.Ф. Карпиевич (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2014. – 108 с.

В материалах Международной научно-практической интернет-конференции «Направления и механизмы совершенствования преподавания в высшей школе» обсуждаются механизмы трансформации деятельности преподавателя учреждений высшего образования, опыт использования современных информационных технологий, способы развития медийной культуры участников образовательного процесса, проблемы развития творческого потенциала педагога.

Содержание материалов предназначено для использования преподавателями, аспирантами, магистрантами, студентами вузов.

# Содержание

*Е.Ф. Карпиевич.* Предисловие ........ 5

1. Актуальные стратегии и механизмы совершенствования образовательного процесса в высшей школе

*Ж.В. Волкова*. Подходы к управлению разработкой и реализацией образовательных программ ........ 10

*Д.И. Губаревич, Е.Ф. Карпиевич*. Совершенствование профессионализма преподавателя: анализ конкретных случаев ........ 15

*Т.И. Краснова*. Виртуальная консалтинговая служба как форма поддержки профессионального развития преподавателей высшей школы ........ 22

*М.В. Кудейко*. Переосмысление роли системы образования в современном информационном пространстве ........ 29

*О.П. Меркулова*. Обратная связь от студентов как ресурс совершенствования профессиональной деятельности преподавателя вуза ........ 33

*А.В. Жук, В.М. Молофеев, Л.М. Хухлындина*. Проблема нормативного регулирования экспорта образовательных услуг ........ 38

*В.В. Самохвал, Л.М. Хухлындина, В.М. Молофеев, А.С. Шибут*. О связи успеваемости студентов, получающих высшее образование первой ступени, с результатами централизованного тестирования. (На примере химического факультета Белорусского государственного университета) .. 42

2. Трансформация университетского образования в условиях информационного вызова

*С.В. Венідзіктаў*. Фарміраванне медыякультурнай кампетэнтнасці ў праваахоўнай сістэме ........ 54

*В.М. Галынский, П.Л. Соловьев*. Online-педагогика ........ 59

*Н.Д. Корчалова*. Образование как экспериментирование в контексте визуальной культуры ........ 64

*О.Ф. Малашенкова*. Подготовка электронных учебно-методических комплексов: новые вызовы для саморазвития преподавателя ........ 70

*А. А. Полонников*. Визуальное событие и визуальное отношение ........ 73

*М.Ю. Чепиков*. Методы и возможности мобильного обучения в гибридном преподавании ........ 95

*С.В. Яскевич, Е.В. Маковская*. Повышение квалификации преподавателей по вопросам использования электронных технологий: опыт ИБМТ БГУ ........ 100

# ФАРМІРАВАННЕ МЕДЫЯКУЛЬТУРНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ Ў ПРАВААХОЎНАЙ СІСТЭМЕ

**С.В. Венідзіктаў**
*Магілёўскі інстытут МУС Рэспублікі Беларусь*

Артыкул прысвечаны развіццю медыякультуры супрацоўнікаў органаў унутраных спраў як фактару устойлівасці прававой сістэмы. У кантэксце новай парадыгмы інфармацыйнай кампетэнтнасці асобы аналізуюцца напрамкі мэтанакіраванага ўдзелу МУС у напаўненні медыясферы дадзенымі прававога характару. Асэнсоўваюцца прычыны супярэчлівага стаўлення аўдыторыі СМІ да навін крымінальна-канфліктнага характару. На прыкладзе лабараторыі адукацыйнага тэлебачання Магілёўскага інстытута МУС разглядаецца патэнцыял медыятызацыі адукацыйнай прасторы "закрытай" навучальнай установы.

The article deals with the development of militia officers' media culture as a factor of the legal system stability. In the context of a new paradigm of individuals' information competence trends of MIA meaningful participation in filling the media sphere with legal information analyzed. The reasons of contradictory attitude of the audience to the news of criminal and conflict nature conceptualized. Potential of using media in educational space of "isolated" school examines on the example of the Laboratory of Educational TV of The Mogilev Institute of the Ministry of Internal Affairs.

Інфармацыйнае грамадства, імклівае пераўтварэнне якога з тэарэтычнай мадэлі ў рэальнасць, характарызуецца зменай характару масавага спажывання дадзеных і узрастаннем аб'ёмаў інфармацыйных плыняў, з якімі сутыкаецца індывід. За 2014 г. аб'ём інфармацыі, што спажываецца чалавекам, перавысіў 8,75 зеттабайтаў, 90 % агульнаўжывальнай інфармацыі было сфармавана ў апошнія 2 гады [2]. У значнай ступені такі рост тлумачыцца змяненнем характаралагічных уласцівасцей медыя, з'яўленнем фармату сеткавага распаўсюджвання. З іншага боку, мы назіраем адставанне працэсу

адаптацыі аўдыторыі медыя да існавання ў наасфернай інфармацыйнай прасторы. Ні псіхалагічна, ні кампетэнтнасна грамадзяне аказваюцца не гатовымі да свядомага ўспрымання і перапрацоўкі медыйных патокаў. Адбываецца размыванне крытэрыяў праўдзівасці інфармацыі, а супярэчнасці паміж рэальнасцю і яе медыйным адлюстраваннем перастаюць успрымацца як рэальнасць. Адначасова ўзнікаюць падставы для актуалізацыі новай парадыгмы інфармацыйнай кампетэнтнасці асобы, якая прадугледжвае высокі ўзровень развіцця культуры спажывання медыяпрадукту. Медыякультурнае развіццё асобы становіцца адной з першачарговых задач адукацыйнай сістэмы. У сувязі з гэтым мы вылучаем два напрамкі: (а) агульная медыяадукацыя, якая стварае аснову для паспяховага засваення навучальных праграм з улікам звароту да новых інфармацыйных тэхналогій; (б) спецыяльная медыяадукацыя (на ўзроўні вышэйшай адукацыі), якая выкарыстоўваецца для фарміравання інфармацыйнай кампетэнтнасці асобы ў прафесійнай сферы.

Калі першы напрамак з'яўляецца крытычна неабходным для паспяховага існавання грамадзяніна ў сучасным соцыуме, то другі актуальны ў сферах дзейнасці, накіраваных на стварэнне змяненняў у грамадстве, яго стабілізацыю. З гэтага пункту гледжання дастатковы ўзровень медыякультурнага развіцця ўяўляецца істотным кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Па-першае, супрацоўнікі МУС ажыццяўляюць дзейнасць у прававой сферы, ўстойлівасць якой прадвызначае стабільнасць грамадскай сістэмы. Гэтая дзейнасць характарызуецца высокай ступенню канфліктнасці, якая адлюстроўвае наяўнасць у соцыуме супярэчнасцей. Па-другое, праблемы ў прававой сферы (злачынствы, правапарушэнні, кампраметуючая інфармацыя і пад.) традыцыйна прыцягваюць увагу СМІ і маюць высокі аўдыторны рэйтынг. Аднак неадэкватнае адлюстраванне ў медыя такой інфармацыі прадвызначае дэфармаванае ўяўленне аўдыторыі аб узроўні канфліктнасці ў грамадстве, выклікае каштоўнасную дэзарыентацыю, што адбіваецца на масавай прававой свядомасці і прававых паводзінах. Па-трэцяе, імідж супрацоўнікаў МУС, які адбіваецца на эфектыўнасці функцыянавання прававой сістэмы, фарміруецца пад уплывам мэдыякантэнту, які мае стыхійны характар. Нарэшце, адсутнасць базавых ведаў у сферы сучаснай медыякультуры зніжае эфектыўнасць узаемадзеяння супрацоўнікаў МУС са СМІ, перашкаджае разуменню заканамернасцей функцыянавання сістэмы органаў унутраных спраў як інфармацыйнай структуры.

Важнасць мэтанакіраванага ўдзелу МУС у напаўненні медыясферы інфармацыяй прававога характару ўзрастае ва ўмовах нізкай рэфлексіўнай актыўнасці беларускай аўдыторыі СМІ. Даследаванні паказалі дастаткова высокі ўзровень даверу да інфармацыі, якая змяшчаецца ў айчынных традыцыйных СМІ, а таксама ў інтэрнэце. Аб'ектыўнай лічыць інфармацыю аб сацыяльна-эканамічных падзеях у Беларусі больш за 40 % насельніцтва, звесткам ў інтэрнэце давяраюць каля 55 % рэспандэнтаў (прычым ва

ўзроставай групе да 20 – 82,5 %) [1, с. 16]. Пры гэтым парадаксальнай выглядае сітуацыя: большая частка аўдыторыі мяркуе, што свабоды слова ў краіне няма (31,7 %) або практычна няма (49,1 %), толькі 13,8 % прытрымліваюцца альтэрнатыўнага пункту гледжання [1, с. 18]. Цікавасць у кантэксце разглядаемай праблемы выклікае тое, што 25,1 % апытаных выказалі меркаванне аб недастатковай увазе айчынных СМІ да прававых пытанняў, 17,4 % адзначылі прабелы ў асвятленні крымінальных праблем [1, с. 23–24]. Такім чынам, даследаванне пацвердзіла заканамернасць: аўдыторыя з большай цікавасцю ўспрымае інфармацыю негатыўнай накіраванасці, якая падмацоўвае агульную негатыўную ацэнку грамадзянамі стану законнасці і правапарадку ў дзяржаве. Безумоўна, навіны і аналітычная інфармацыя, прысвечаная злачынствам і правапарушэнням, важныя ў грамадзянскай супольнасці: як і ў любой складанай сістэме, звесткі аб адхіленні ад прынятых нормаў стымулюць соцыум да вырашэння адпаведных праблем. Аднак спекулятыўны характар падачы падобнай інфармацыі, характэрны для СМІ, здольны справакаваць рост сацыяльнай напружанасці.

Сітуацыю з успрыманнем прававой сістэмы аўдыторыяй можна апісаць наступным чынам. СМІ з улікам камерцыйных інтарэсаў адбіраюць для тыражыравання шакіруючую, правакацыйную інфармацыю, відазмяняюць яе ў адпаведнасці з патрабаваннямі медыяфармату, не ўлічваюць магчымы ўплыў на свядомасць. Аўдыторыя з невысокім узроўнем медыякампетэнтнасці ўспрымае інфармацыю ў скажоным выглядзе, кампетэнтная частка аўдыторыі – адмаўляецца ад спажывання. Зыходны элемент гэтага інфармацыйнага ланцужку – прававая сфера – аказваецца на перыферыі медыядыскурсу. Нарэшце, як і любая адносна «закрытая» сістэма, прававая сфера спараджае дэфіцыт запатрабаванай інфармацыі, які правакуе ўзнікненне чутак.

Сістэма органаў унутраных спраў не мае магчымасці ўплываць ні на ўзровень медыякультурнага развіцця аўдыторыі СМІ, ні на прынцыпы функцыянавання сучасных медыя, аднак яна здольная кантраляваць патокі інфармацыі, якія паступаюць у СМІ з прававой сферы. У задачы даследавання не ўваходзіць аналіз дзейнасці аддзяленняў па сувязях з грамадскасцю і прэс-служб МУС, для якіх дадзеная функцыя з'яўляецца асноўнай. Цікавасць уяўляе адказ на пытанне, якім чынам ўкараненне медыяадукацыйных элементаў у працэс падрыхтоўкі супрацоўнікаў міліцыі здольна ўплываць на ўстойлівасць прававой сістэмы ў цэлым.

У гэтай сувязі разгледзім адукацыйны праект, які з 2012 г. рэалізуецца ў Магілёўскім інстытуце МУС. Пры кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін створана структура «Лабараторыя адукацыйнага тэлебачання», дзейнасць якой накіравана як на медыятызацыю адукацыйнай прасторы, так і на развіццё медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці курсантаў. Функцыянаванне лабараторыі ажыццяўляецца ў некалькіх кірунках: (а) забеспячэнне навучальнай установы аўдыёвізуальнай дыдактычнай прадукцы-

яй з улікам адукацыйных праграм і стандартаў; (б) інтэграцыя адукацыйнай прасторы і лакальнай медыясферы, якая адлюстроўвае тэндэнцыю да інфарматызацыі і візуалізацыі навучальнага працэсу; (в) стварэнне базы для інфармацыйнай інтэграцыі інстытута ў медыяпрастору рэгіёну і рэспублікі, якая спрыяе фарміраванню станоўчага іміджу навучальнай установы; (г) навукова-метадычная работа па абагульненню, сістэматызацыі і тэарэтычнаму асэнсаванню дзейнасці структуры з мэтай выпрацоўкі рэкамендацый па ўкараненню медыяадукацыйных сродкаў у іншых ведамасных навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

Медыятызацыя адукацыйнай прасторы не абмяжоўваецца пашырэннем выкарыстання дыдактычнай відэапрадукцыі па профільных і агульнагуманітарныя дысцыплінах – яна суправаджаецца развіццём навыкаў рэфлексіўнага, крытычнага ўспрымання прадукцыі СМІ. Самастойная падрыхтоўка ў інстытуце інфармацыйных сюжэтаў для рэгіянальных СМІ дазваляе курсантам прасачыць ланцужок ад стварэння інфармацыйнай нагоды да рэакцыі аўдыторыі на паведамленне (асабліва дзейсна пры размяшчэнні відэасюжэтаў у інтэрнэце). Важна, што скажэнне інфармацыі ў гэтым ланцужку пачынае ўспрымацца навучэнцамі як непазбежнае.

Больш зразумелымі становяцца для курсантаў і заканамернасці фарміравання іміджу супрацоўнікаў міліцыі. Паводле сацыялагічных апытанняў, поўны давер да органаў унутраных спраў выказваюць каля 35 % грамадзян, у поўнай бяспецы маёмасьці перакананыя 40 % насельніцтва Беларусі. Улічваючы, што значная частка жыхароў рэспублікі непасрэдна з працай праваахоўных структур не сутыкалася, можна меркаваць, што асноўнай крыніцай іміджу прававой сістэмы з'яўляюцца СМІ. З мэтай дэманстрацыі іміджавага патэнцыялу медыятэхналогій ў 2013–2014 гг. лабараторыяй рэалізаваны праект «Нарад па-за чаргой» – тэлевізійная праграма, якая раскрывае спецыфіку дзейнасці розных органаў і падраздзяленняў МУС.

Папярэднія вынікі даследавання прадвызначылі правядзенне вясной 2014 г. у Магілёўскім інстытуце МУС Міжнароднай канферэнцыі «Медыясфера і медыяадукацыя: спецыфіка ўзаемадзеяння ў сучаснай сацыякультурнай прасторы». Аб актуальнасці абранай праблематыкі сведчыць праведзенае намі ў інстытуце восенню 2014 г. даследаванне, якое дазволіла выявіць наяўнасць ўстойлівых супярэчнасцей у працэсе медыякультурнага развіцця курсантаў: высокую ступень даверу да нефармальных каналаў камунікацыі пры вольным доступе да кантэнту аўтарытэтных медыя; неразвітасць суб'ектыўных механізмаў пошукава-аналітычнага ўспрымання друкаваных СМІ; ігнараванне фактаў скажэння інфармацыі пры ўмове прывабнай формы яе падачы; нізкую патрабавальнасць да якасці інфармацыі; адсутнасць ўстойлівага меркавання адносна ўплыву СМІ на дынаміку злачыннасці і інш.

Такім чынам, мэтазгодна казаць аб адноснай аддаленасці ў часе вынікаў ўкаранення медыяадукацыйных сродкаў у працэс падрыхтоўкі кадраў

для органаў унутраных спраў. Найбольш істотным нам уяўляецца развіццё ў супрацоўнікаў разумення непазбежнасці супярэчнасцеў паміж рэальным станам прававога асяроддзя і яго медыйным адлюстраваннем, фарміраванне ў курсантаў адэкватнага ўяўлення аб заканамернасцях утварэння іміджу міліцыі, а таксама ўсведамленне ўласнай ролі ў захаванні інфармацыйнай ўстойлівасці прававой сістэмы.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Информационное пространство Беларуси как объект социологического анализа: региональный аспект: отчет о НИР [№ госрегистрации 20122130] / Могилевский институт региональных социально-политических исследований ; рук. темы Н.Е. Лихачев. – Могилев : МИРСПИ, 2012.
2. Short, J. E. How Much Media? 2013 Report on American Consumers / J. E. Short // Institute for Communication Technology Management // USC Marshall School of Business [Electronic resource]. – 2014. – Mode of access : http://www.marshall.usc.edu/faculty/centers/ctm/research/how-much-media. – Date of access : 04.09.2014.